■ Сітуацыя

ЯК РАССЕКЧЫ ВУЗЕЛ ДАЎГАБУДУ

Будтрэсты зараз «шукаюць» абаротныя сродкі, пераглядаюць партфель заказаў і займаюцца аптымізацыяй кіруючых кадраў

Аб актуальных пытаннях дзеяння будаўнічага комплексу Беларусі карэспандэнту «Звязды» расказвае першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва краіны Ірына АРХІПАВА.

— Кіраўніцтва нашай краіны запатрабавала ад міністэрства навесці парадак у сферы будаўніцтва жылля. У першую чаргу меліся на ўвазе праблемныя дамы з тэрмінамі будаўніцтва звыш вызначаных нарматываў...

— Па гэтым пытанні было арганізавана пашыранае пасяджэнне Мінгарвыканкама. Цяпер па праблемных дамах тэхнічныя пытанні цалкам адпрацаваны, дадзены заданні, складзены адпаведныя графікі ўводу жылля ў эксплуатацыю, і ўвогуле робіцца ўсё магчымае, каб дабудаваць гэтыя дамы ўжо сёлета. Горадам прынята рашэнне аб перападпарадкаванні раённых упраўленняў капітальнага будаўніцтва. Справа ў тым, што ў структуры УКБ Мінгарвыканкама такіх праблемных дамоў няма, а гэта сведчыць аб эфектыўнай працы заказчыка.

У будтрэстаў не хапае абаротных сродкаў

— А адкуль узялася гэтая вялікая хваля даўгабуду?

— Усё пачалося ў 2011 годзе пасля мая, калі новыя цэны на энерганосьбіты і ўвогуле складаная сітуацыя з фінансаваннем засталі будаўнікоў у розны перыяд будаўніцтва жылых дамоў. У асобных структур было пабудавана на гэты час 90 працэнтаў дома, а ў іншых толькі 50 ці нават 10 працэнтаў. Зразумела, што тыя арганізацыі, якім неабходна было дабудоўваць дом па старых дагаворах амаль з нуля, а курс замежнай валюты павялічыўся ў некалькі разоў, сутыкнуліся з вельмі вострай праблемай недахопу сродкаў для завяршэння будаўніцтва.

Так адбылося, што калі адразу ўдзельная вага кошту будматэрыялаў пры працэнтоўцы дома складала каля 50 працэнтаў, то потым яна павялічылася да 70 працэнтаў і нават больш. Таму на заробкі будаўнікам заставалася менш сродкаў. Мы зарплаты рабочым у жыллёвым сектары не павялічвалі, бо неабходна было стрымліваць кошт квадратнага метра для тых, хто будаваўся ў той час. Усё рабілася так, каб максімальна дабудаваць дамы па старых цэнах і даць людзям ключы.

Увесь гэты час будаўнічыя арганізацыі дабудоўвалі такія дамы за кошт у тым ліку і ўласных сродкаў. Людзі атрымалі жыллё, і гэта добра, але абаротныя сродкі ў арганізацыях былі «вымытыя» амаль цалкам. У будаўніцтва з'явілася даволі высокая дэбіторская запазычанасць, калі па прамысловых прадпрыемствах будкомплексу яна дасягае месячнай выпрацоўкі, а ўвогуле па будгаліне складае зараз каля 3 трлн рублёў. У разліку на кожнае прадпрыемства гэта дадатковая сур'ёзная фінансавая нагрузка. Таму цяпер, у першую чаргу, трэба тэрмінова гасіць гэтую запазычанасць.

— За кошт чаго будтрэсты могуць паправіць сваё фінансавае становішча?

— Неабходна стварыць эфектыўную арганізацыю будаўніцтва і ажыццяўляць рытмічнае фінансаванне ўсіх аб'ектаў будаўніцтва. Вы ведаеце, што ў Расіі на бюджэтны заказ з боку будаўнічых арганізацый стаіць чарга. Там арганізацыі дзейнічаюць без авансавання — за кошт крэдытных сродкаў ці ўласных грошай. А ў нас крыху іншая сітуацыя. Рэнтабельнасць пры будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў мінімальная. Мне здаецца, што сёння будаўнікам трэба даць магчымасць зарабляць гэтую «абаротку» на бюджэтных аб'ектах, каб атрыманая там рэнтабельнасць вяла да ўзнаўлення існуючага патэнцыялу.

Зараз на дзяржаўных аб'ектах максімальная рэнтабельнасць складае не больш як 5 працэнтаў. А ў сённяшні паслякрызісны перыяд гэта недастаткова.

— Трэсты цяпер узводзяць і камерцыйныя аб'екты?

— Так. Кожны асобны будтрэст трэба загрузіць такім чынам, каб удзельная вага бюджэтных і камерцыйных аб'ектаў давала неабходную сёння рэнтабельнасць. Каб прадпрыемства нармальна развівалася, мінімальная рэнтабельнасць у будаўніцтве павінна складаць 8—12 працэнтаў. Па бюджэтных аб'ектах яна складае 5 працэнтаў, таму па камерцыйных трэба рабіць 25 працэнтаў і больш. Тут трэба шукаць баланс аб'ёмаў бюджэтнага і камерцыйнага будаўніцтва.

А вось гэтым павінны займацца органы ўпраўлення пры фарміраванні розных праграм. Трэба так размяркоўваць заказы, каб усе бударганізацыі дзейнічалі эфектыўна.

Рэнтабельнасць пры будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў мінімальная. Мне здаецца, што сёння будаўнікам трэба даць магчымасць зарабляць гэтую «абаротку» на бюджэтных аб'ектах, каб атрыманая там рэнтабельнасць вяла да ўзнаўлення існуючага патэнцыялу.

— Ці існуюць пытанні з бюджэтным фінансаваннем будаўніцтва жылля?

— Сёлета бюджэт разлічваецца з будтрэстамі і ў адпаведнасці з месячным графікам. Аднак аб'ём грашовых сродкаў з 25 па 30 чысла рэальна адпрацаваць у гэтым месяцы ўжо нельга. Вось і атрымліваецца, што фінансаванне ідзе са спазненнем. Наконт аб'ёмаў фінансавання. У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам фінансуюцца будучыя аб'ёмы ў памеры не больш за 50 працэнтаў ад сабекошту, а ўдзельная вага кошту будматэрыялаў зараз павялічылася да 70 працэнтаў. Таму гэтых грошай будаўнікам нават не хапае для набыцця неабходных матэрыялаў на наступны месяц працы.

— Ці існуюць сёння ў галіне праблемы з кваліфікаванымі кадрамі і рабочымі? У свой час шмат талковых будаўнікоў з'ехалі па доўгі рубель у Маскву і Піцер...

— Гавораць, што добра там, дзе нас няма. Але гэта не заўсёды так. Цяпер многія вяртаюцца дадому. Калі прадпрыемства мае высокаэфектыўную эканоміку і прапануе работнікам добрыя заробкі, то і праблем з кадрамі там не існуе. Калі нехта там і паехаў, то на іх месца прыйшлі іншыя, маладыя і перспектыўныя работнікі. Галоўнае тут, каб у арганізацыі былі аптымальныя суадносіны паміж колькасцю інжынернага складу і рабочых. Тады і эфектыўнасць дзеяння ўсёй будструктуры будзе лепшая, а заробкі стануць большымі. Акрамя гэтага, летась у тры этапы мы павялічылі заробкі рабочым, таму зараз у будгаліне магчыма зарабляць ужо сур'ёзныя грошы. Па гэтай прычыне недахоп кадраў у галіне цяпер актыўна аднаўляецца.

Разам з тым у Мінску зараз назіраецца бум будаўніцтва будынкаў рознай функцыянальнай накіраванасці, што звязана з будучым чэмпіянатам свету па хакеі. Ва ўсіх раёнах сталіцы ідзе будоўля. Таму ўзнікаюць пытанні з планаваннем будаўнічых магутнасцяў і патэнцыялам будаўнічых кадраў і тэхнікі.

— Заўвагі застаюцца і да праекціроўшчыкаў?

— Пытанні на гэтую тэму існуюць, бо на асобных аб'ектах перадынвестыцыйны цыкл быў не заўсёды дасканалы. Часам заказчык добра не пралічваў праектную дакументацыю свайго аб'екта. Нам здаецца, што трэба наблізіць генпадрадчыка да распрацоўкі гэтай самай дакументацыі. Каб практыкі прымалі ўдзел у арганізацыйнай дзейнасці на самым стартавым этапе будаўніцтва жылых дамоў.

— Шмат скаргаў з боку насельніцтва ўзнікае зараз па кошце квадратнага метра новага жылля. Ці магчыма гэты кошт трымаць сёння на ўзроўні сярэдняга месячнага заробка?

— Сярэднія заробкі па краіне вагаюцца... Тут пытанне ў тым, што трэба аптымізаваць і сабекошт квадратнага метра і павялічваць даходы людзей да рэальнага кошту жыллёвага квадрата. Чым больш эфектыўна працуе прадпрыемства, тым больш магчымасцяў павялічваць заробкі людзям.

У апошнія гады адбылася маштабная мадэрнізацыі домабудаўнічых камбінатаў. Гэтая мадэрнізацыя прадугледжвала павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля ў краіне да 10 млн кв. метраў за год. За апошнія 2 гады такі планавы аб'ём будаўніцтва жылля скараціўся ўжо амаль удвая. Таму на поўную праектную магутнасць нашы домабудаўнічыя камбінаты не працуюць, а ў выніку губляецца запланаваная эфектыўнасць вытворчасці.

Зараз мы ставім задачу па выхадзе на экспарт прадукцыі гэтых заводаў. Аднак заводы знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, дзе ў кожнага прадпрыемства існуе рознае транспартнае плячо. Эфектыўнасць экспарту як паслуг, так і будматэрыялаў захоўваецца ў тым выпадку, калі адлегласць паставак складае не больш за 500 кіламетраў. У іншым выпадку не працуе лагістыка гандлю, бо беларуская будаўнічая прадукцыя робіцца ўжо неканкурэнтаздольнай па цане.

У тым ліку і па гэтай прычыне кошт квадратнага метра панэльнага жылля пасля мадэрнізацыі заводаў не можа заставацца на мінулым мінімальным узроўні. Зараз на заводах выкарыстоўваецца новае сучаснае абсталяванне, у набыцці якога былі задзейнічаны крэдытныя рэсурсы. З сучасных будматэрыялаў будуецца больш якаснае жыллё. Усе гэтыя акалічнасці павялічваюць сабекошт жыллёвага квадрата.

— Што зараз робіцца, каб увогуле выключыць паўтарэнне сітуацыі з праблемнымі дамамі?

— Прыняты новыя нарматыўныя акты па долевым будаўніцтве, дзе прадугледжана дадатковая адказнасць заказчыка за ўзятыя на сябе абавязацельствы. Уводзіцца дзяржаўны заказ на будаўніцтва жылля, які аптымізуе і тэрміны яго ўзвядзення, і кошт жыллёвага «квадрата». Прапрацоўваюцца пытанні дадатковага прыцягвання інвестыцый у будаўніцтва жылля праз такія інструменты, як іпатэчнае крэдытаванне і сістэма будзберажэнняў. Пасля далейшага зніжэння працэнтных ставак па крэдытах рэальна запрацуюць і гэтыя інструменты фінансавання жыллёвага будаўніцтва.

Сяргей КУРКАЧ

■ Супрацоўніцтва

НАСТРОЙ НА КАНСТРУКТЫЎНУЮ РАБОТУ

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу спікеры абедзвюх палат беларускага парламента сустрэліся з прэзідэнтам Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Цюмалі Сайнясонам. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся ўсе аспекты двухбаковых адносін Беларусі і Лаоса, а таксама супрацоўніцтва паміж парламентамі краін.

Старшыня Савета Рэспублікі Анатоль РУБІНАЎ адзначыў, што апошнія некалькі гадоў зносіны паміж Беларуссю і Лаосам не былі інтэнсіўнымі. Але сёлетні візіт на такім высокім узроўні «адкрывае новую старонку ў гісторыі адносін нашых краін». Спікер верхняй палаты Парламента выказаў таксама спадзяванне, што супрацоўніцтва будзе абапірацца на ўжо існуючую спадчыну, што засталася краінам з савецкіх часоў. Тады многія лаоскія дзяўчаты і юнакі праходзілі навучанне ў краінах СССР, у тым ліку і ў Беларусі. Анатоль Рубінаў таксама падкрэсліў, што ў прынцыпах вядзення як унутранай, так і знешняй палітыкі Беларусь і Лаос вельмі падобныя. Менавіта з гэтых прычын зараз можна спадзявацца на плённае супрацоўніцтва нашых краін.

«Сам факт сустрэчы сведчыць пра тое, што прэзідэнт Лаоса надае вялікую ўвагу развіццю міжпарламенцкіх адносін, — сказаў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. — Трэба таксама адзначыць, што ў нас апошнім часам вельмі добра развіваюцца адносіны з парламентамі краін Паўднёва-Усходняй Азіі». Паводле слоў Уладзіміра Андрэйчанкі, такі прагрэс стаў магчымым толькі пасля таго, як беларускі Парламент атрымаў статус назіральніка ў Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Спікер аддзячыў лаоскім калегам за падтрымку пры атрыманні гэтага статусу. «У такім жа фармаце мы хацелі б супрацоўнічаць і з Нацыянальным сходам Лаоса», — зазначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Цюмалі САЙНЯСОН аддзячыў беларускай дэлегацыі за цёплы прыём і падзяліўся ўражаннямі ад першага дня візіту, калі ён сустрэўся з Прэзідэнтам і прэм'ер-міністрам Беларусі. «Я ўпэўніўся ў тым, што нашыя народы маюць падобныя рысы, такія як чалавекалюбства, гасціннасць, гераічныя традыцыі барацьбы з іншаземнымі захопнікамі», — сказаў прэзідэнт Лаоса. Цюмалі Сайнясон выказаў таксама свае думкі, што датычыліся міжпарламенцкіх зносін. Сярод яго прапаноў былі такія, як запрашэнне беларускіх парламентарыяў з афіцыйным візітам у Лаос, міжпарламенцкая падтрымка на глабальнай і рэгіянальнай арэнах, абмен вопытам і іншыя.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

ЦІКАВЫ ЛАОС

Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка з'яўляецца адной з тых краін Паўднёва-Усходняй Азіі, інтарэс да чаго ўзаемадзеяння з якімі быў праяўлены Беларуссю ў апошнія гады. Так, у красавіку 2013 года Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што «мы вельмі актыўна працуем у рэгіёне, у якім размешчаны Сінгапур, Інданезія, і наогул у Паўднёва-Усходняй Азіі. У нас там вялікія інтарэсы». Гэтую зацікаўленасць пацвердзілі і візіты ў сакавіку 2013 года Аляксандра Лукашэнкі ў Інданезію і Сінгапур. Што датычыцца Лаоса, то ў чэрвені 2012 г. гэту краіну з афіцыйным візітам наведаў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. Падчас візіту ён перадаў запрашэнне беларускага кіраўніка дзяржавы прэзідэнту Лаоса наведаць Беларусь з афіцыйным візітам. Запрашэнне было прынята, і 30 чэрвеня 2013 года прэзідэнт Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Цюмалі Сайнясон прыбыў з візітам у Беларусь.

Насельніцтва Лаоса досыць невялікае — прыкладна шэсць з паловай мільёнаў чалавек. У той жа час тэрыторыя гэтай краіны дастаткова значная па мерках Паўднёва-Усходняй Азіі — больш як 236 тыс. кв. км. Гэты фактар робіць Лаос краінай з найменшай шчыльнасцю насельніцтва ў рэгіёне. Узровень развіцця эканомікі дастаткова нізкі. ВУП на душу на парытэце пакупной здольнасці складае каля 3 тысяч долараў, што ў пяць разоў ніжэй, чым у Беларусі. Трэба адзначыць, што рост прывабнасці эканомікі Лаоса ў значнай ступені звязаны з высокімі тэмпамі развіцця эканомікі ў апошнія гады. Міжнародныя наглядальнікі адзначаюць таксама вялікі прагрэс краіны ў барацьбе з беднасцю.

Як сусед Кітая Лаос можа разлічваць, што шэраг вытворчасцяў з тэрыторыі КНР будзе ў бліжэйшыя гады перанесены на яго тэрыторыю — у сувязі з пастаянным пошукам кітайскімі прадпрымальнікамі таннай працоўнай сілы. Вядома, гэта будуць пераважна не самыя сучасныя вытворчасці (іх кітайцы імкнуцца пакідаць на сваёй тэрыторыі), але, тым не менш, гэта надасць дадатковыя тэмпы росту эканомікі. Пасля стварэння плануемай Зоны свабоднага гандлю краін Паўднёва-Усходняй Азіі з Кітаем тавары з тэрыторыі Лаоса змогуць свабодна трапляць на вялізны кітайскі рынак. Тут ужо выразна прасочваецца і беларускі інтарэс. Адна справа — везці гатовыя тавары з Беларусі ў Кітай праз увесь кантынент, іншая — прывезці з Беларусі толькі камплектуючыя, сабраць гатовую прадукцыю на тэрыторыі Лаоса, улічваючы станоўчы фактар таннай працоўнай сілы, і адправіць на экспарт у Кітай. Але такога роду супрацоўніцтва Беларусь зможа наладзіць у больш аддаленай перспектыве.

Цяпер на парадку дня пытанні па ўдзеле Рэспублікі Беларусь у садзейнічанні развіцця, перш за ўсё, сыравіннага сектара лаоскай эканомікі. У прыватнасці, Лаос валодае вялікімі радовішчамі калійных соляў, і яму цікавы вопыт Беларусі ў іх здабычы. У сувязі з гэтым магчыма развіваць такія формы кааперацыі, якія будуць выгадны абедзвюм краінам, і непасрэдны ўдзел у гэтым з беларускага боку будзе прымаць таварыства «Белгорхімпрам». Вялікія ў Лаосе радовішчы і іншых карысных выкапняў. Так, сур'ёзнае значэнне маюць перспектывы здабычы медзі, золата і волава, якія ўжо з'яўляюцца аднымі з найбольш важных экспартных тавараў Лаоса і ў праектах па пошуку і здабычы якіх можа паўдзельнічаць і Беларусь.

Паколькі Лаос з'яўляецца ў асноўным аграрнай эканомікай, прадстаўнікам гэтай краіны цікавы і беларускі вопыт развіцця сельскай гаспадаркі. Сур'ёзныя перспектывы мае стварэнне сумесных прадпрыемстваў, у тым ліку і тых, у якіх выкарыстоўваецца беларуская сыравіна. Цікавы Лаос і прадстаўнікам беларускай фармацэўтычнай галіны, якія шукаюць новыя перспектыўныя кірункі для экспарту беларускіх лекаў. Нядрэнныя зачыны ў Лаосе ўжо зроблены таварыствам «МАЗ», якое здолела наладзіць пастаўкі сваёй тэхнікі праз в'етнамскіх партнёраў. Зараз гаворка ідзе ўжо аб прамым супрацоўніцтве. Прыклад «МАЗа» хоча пераняць і «МТЗ», зацікаўлены ў збыце трактароў. Уяўляюць цікавасць для лаоскай дэлегацыі і беларускія магчымасці па навуковым супрацоўніцтве — у прыватнасці па мадэрнізацыі эканомікі Лаоса. Можа аказаць садзейнічанне Беларусь і ў атрыманні грамадзянамі Лаоса якаснай адукацыі на сваёй тэрыторыі.

Рэалізацыі гэтых і іншых магчымых кірункаў кааперацыі дзвюх краін будзе спрыяць падпісаны падчас сустрэчы двух прэзідэнтаў дагавор аб дружалюбных адносінах і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі, «спецыялісты і міністры намецілі шляхі нашага супрацоўніцтва, нам трэба больш хуткімі тэмпамі рухацца гэтымі шляхамі».

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.

■ Абітурыент-2013

СЕРТЫФІКАТЫ АТРЫМАЮЦЬ УСЕ, ХТО НАБРАЎ БОЛЬШ ЯК 1 БАЛ

Учора арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання агучылі вынікі цэнтралізаванага тэсціравання па замежных мовах і сусветнай гісторыі навейшага часу. Сто балаў сёлета атрымалі пяць удзельнікаў ЦТ па англійскай мове, два — па нямецкай і два — па французскай. А не пераадолелі парог у 20 балаў на ЦТ па замежных мовах 22,38% абітурыентаў. На ЦТ па сусветнай гісторыі навейшага часу максімальны бал атрымаў адзін чалавек, а менш як 20 балаў набралі 9,86% абітурыентаў.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання паведамілі, што перадача прадстаўнікам пунктаў тэсціравання сертыфікатаў удзельнікаў ЦТ па выніках выпрабаванняў у асноўны і рэзервовы дні будзе весціся, пачынаючы з 8 ліпеня. Сертыфікаты змогуць атрымаць усе ўдзельнікі ЦТ, якія набралі 1 бал і больш. Нягледзячы на ўстаноўленыя для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі парогі ў 10, 15 і 20 балаў, паступаць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы можна з любой колькасцю балаў (акрамя нуля!).

Сертыфікаты будуць выдавацца абітурыентам пры прад'яўленні дакумента, які сведчыць іх асобу, і пропуску з адзнакай «Тэсціраванне прайшоў». Ні бацькам, ні сваякам абітурыента сертыфікаты выдавацца не будуць, нават калі тыя прад'явяць у пункт тэсціравання дакументы ўдзельніка тэставых выпрабаванняў. Згодна з палажэннем аб правядзенні ЦТ, абітурыент атрымлівае сертыфікат асабіста пад подпіс у ведамасці выдачы сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання. Затым пропуск у яго адбіраецца. У выпадку страты пропуска абітурыент падае заяву аб выдачы яму сертыфіката без прад'яўлення пропуска. У выпадку замены дакумента, які сведчыць асобу абітурыента, у перыяд паміж датай рэгістрацыі ў якасці абітурыента і датай выдачы сертыфіката ці падачы дакументаў у прыёмную камісію навучальнай установы, сертыфікат афармляецца ў адпаведнасці са звесткамі новага дакумента, які сведчыць асобу. А ў выпадку страты сертыфіката (ці калі знешні выгляд сертыфіката быў сапсаваны) Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў афармляе яго дублікат. У гэтым выпадку ў правым верхнім ражку на сертыфікаце ставіцца адзнака «дублікат». Не выдадзеныя абітурыентам сертыфікаты захоўваюцца ў пунктах правядзення тэсціравання да канца гэтага каляндарнага года, а затым знішчаюцца.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў таксама паабяцалі, што да завяршэння тэрміну прыёму дакументаў у ВНУ другога патоку ў гандлёвую сетку краіны паступяць зборнікі з тэставымі заданнямі, якія былі прапанаваны ўдзельнікам ЦТ гэтага года, — усе варыянты па ўсіх дысцыплінах. Такім чынам, у хуткім часе не толькі ў абітурыентаў будзе магчымасць скласці ўласнае меркаванне аб змесце і складанасці матэрыялаў цэнтралізаванага тэсціравання, але і ў іх бацькоў, настаўнікаў, выкладчыкаў і рэпетытараў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Дэмаграфія

ШЛЮБ ЛЁГКА СТВАРАЕЦЦА І ЛЁГКА... РАЗБУРАЕЦЦА?

Упершыню ўдалося сабраць поўныя звесткі па шлюбах і разводах у Беларусі з 1946-га па 2010 год. Гэта стала магчымым у межах першага этапу рэспубліканскага даследавання «Фарміраванне сям'і, стабільнасць сямейных стасункаў беларусаў і нараджальнасць у зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах жыцця». Ініцыятарамі падобнага доследу сталі Фонд ААН у галіне народанасельніцтва, Дзіцячы фонд ААН і Дэпартамент па эканамічных і сацыяльных пытаннях Сакратарыята ААН.

Паводле слоў **каардынатара праграм Фонда ААН у галіне народанасельніцтва Таццяны ГАПЛІЧНІК,** наступным этапам даследавання стане правядзенне сацыялагічнага апытання сярод 7 тысяч хатніх гаспадарак. Апытанне дазволіць сабраць інфармацыю аб асаблівасцях працэсу фарміравання сям'і, стасункаў паміж шлюбнымі партнёрамі, бацькамі і дзецьмі, а таксама ацаніць, як «рэагуюць» сем'і на тыя ці іншыя захады сямейнай палітыкі.

Аўтар даследчай працы «Аналіз тэндэнцый шлюбнасці і разводаў насельніцтва Рэспублікі Беларусь з 1946-га па 2010 год», галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі НАН Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар Людміла ШАХОЦЬКА:

— Паказчык шлюбнасці вельмі важны, паколькі сур'ёзна ўплывае на тую ж нараджальнасць (у шлюбе яна, зразумела, вышэйшая), на працягласць жыцця, захваральнасць і смяротнасць (вядома, што людзі «шлюбныя» жывуць даўжэй за халастых і разведзеных). Можна сказаць, што ў 40-я ў нас было больш шлюбаў, заключаных у горадзе, чым у вёсцы. Паступова сітуацыя змянілася, і сёння большасць шлюбаў заключаецца ў гарадах. У 1990-я колькасць людзей, якія бралі шлюб, рэзка знізілася. Зараз паказчык шлюбнасці хоць і зніжаецца, аднак застаецца адным з самых высокіх сярод развітых еўрапейскіх краін. У параўнанні з 50-мі ў 4 разы выраслa колькасць паўторных шлюбаў...

✓ Каля 6 працэнтаў нашых мужчын і 4 працэнты жанчын ва ўзросце да 50 гадоў ніколі не былі ў шлюбе. Хутка расце паказчык бясшлюбнасці сярод сельскіх мужчын. У пэўнай ступені гэта вынік дыспрапорцыі палоў. У актыўным узросце ў сельскай мясцовасці для маладых хлопцаў не хапае дзяўчат адпаведнага ўзросту.

✓ Ужо ва ўзросце 40-44 гады больш як для 25 працэнтаў незамужніх жанчын няма свабоднага мужчыны адпаведнага ўзросту. Гэта вынік больш высокага ўзроўню смяротнасці мужчын і больш высокага паказчыка аўдавення сярод жанчын.

✓ Сярэдні ўзрост уступлення ў першы шлюб вырас з 1995-га па 2011 год у мужчын і жанчын на 2,5 года.

✓ Жаніхі і нявесты ў найбольш актыўным узросце часцей заключаюць шлюб з аднагодкамі. Аднак у апошнія гады даволі распаўсюджанай з'яўляецца сітуацыя, калі нявеста старэйшая за жаніха. Мужчыны ў паўторным шлюбе часцей рэгіструюць шлюб з больш маладымі жанчынамі.

✓ Верагоднасць уступіць у першы шлюб у жанчын ва ўзросце да 27 гадоў значна вышэй, чым у іх равеснікаў мужчын. Пасля 27 гадоў сітуацыя мяняецца на процілеглую, і ўжо ў мужчын вышэй верагоднасць уступлення ў першы шлюб.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аўтар даследчай працы «Аналіз тэндэнцый шлюбнасці і разводаў насельніцтва Рэспублікі Беларусь з 1946 па 2010 гады», доктар геаграфічных навук БДУ, прафесар Кацярына АНТЫПАВА:

— У 60-я кардынальна пачало мяняцца стаўленне да скасавання шлюбу. Насельніцтва пачало больш лаяльна ставіцца да гэтай з'явы. Тады загаварылі пра такое паняцце, як «крызіс інстытута сям'і». Сёння ў нас адна з самых высокіх у Еўропе колькасць скасаваных шлюбаў. Прычым у гарадах колькасць разводаў прыкладна ў 2 разы вышэй, чым на вёсцы. Калі ў 70-я адзін развод прыпадаў на 3 шлюбы, то цяпер — на 2. Наогул першы шлюб працягваецца ў сярэднім каля 10 гадоў, другі — каля 9-ці. Разам з тым, самыя ўразлівыя ў гэтым сэнсе шлюбы, «узрост» якіх ад 1 да 4 гадоў. Відавочна, з гэтай катэгорыяй неабходна працаваць. Безумоўна, неабходна працягваць даследаванні і выявіць, чаму маладыя людзі так лёгка ставяцца да скасавання шлюбу, да ўступлення ў наступны шлюб? Вядома, што ў Еўропе сёння менш разводаў, аднак і колькасць незарэгістраваных шлюбаў там вышэй — да 30 працэнтаў. У нас — каля 5...

1. Сучасны ўзровень разводаў у нашай краіне ацэньваецца як вельмі высокі, складае 4 разводы на 1000 чалавек, што лічыцца дэмаграфічнай пагрозай устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю.

2. Значны штогадовы рост колькасці разводаў адбыўся паміж 1970 і 1997 гадамі, пасля чаго да 2004 года назіраўся перыяд спаду, а затым зноў колькасць разводаў пачала расці.

3. Найбольшая колькасць разводаў у Беларусі прыпадае на ўзрост 25-29 і 30-34 гады.

4. У сярэднім у нас сёння распадаецца адзін з двух шлюбаў.

5. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя перавагі першых разводаў (86 працэнтаў) над паўторнымі (14 працэнтаў).

6. Пераважаюць разводы ў сем'ях, якія маюць адно дзіця, і ў сем'ях без дзяцей.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Здарэнне

У МІНСКАЙ ПАДЗЕМЦЫ ЗАГІНУЎ ГРАМАДЗЯНІН

На станцыі сталічнага метро на рэйкі ўпаў мужчына.

Здарэнне адбылося амаль у 14 гадзін дня на другой лініі метрапалітэна. З перона станцыі «Кунцаўшчына» (у напрамку станцыі «Магілёўская») на пуці звалiўся 29-гадовы грамадзянін. Пасля зняцця напружання работнікі метрапалітэна дасталі мужчыну назад на перон. Затрымка руху электрацягнікоў склала 8 хвілін. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў у 14.20 была вымушана канстатаваць смерць... Яе прычына ўстанаўліваецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЮЦЦА ЎМЕЛЬЦЫ РУБІЦЬ ЗРУБ З ДЗЕЛАВОЙ ДРАЎНІНЫ.

КУПЛЮ 50 бярозавых венікаў.

Тэл. **8 029 652 78 84**, г. Мінск.

Уважаемые акционеры ОАО «Молодечнолес»

19 июля 2013 г. по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 1-го Мая, 106 состоится внеочередное собрание акционеров

ОАО «Молодечнолес».

Повестка дня:

1. О выплате дивидендов за 2-ой квартал 2013 г.

Начало работы собрания — **19 июля 2013 г. в 11.00.**

Регистрация участников собрания — с 9.00. до 10.30 по предъявлению документа, удостоверяющего личность.

УНП 600066488

Открытое акционерное общество «Брестский комбинат строительных материалов» (224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28, тел. 95-02-06) приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные открытым акционерным обществом «Брестский комбинат строительных материалов» (224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28), в количестве до 1000 штук по цене 600 000 белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвестору. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, – с 10.07.2013 г. по 19.07.2013 г. по адресу: г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28.

Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 22.07.2013 г. по 30.08.2013 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28.

Сроки, форма и порядок оплаты – путем перечисления денежных средств на счет продавца не позднее 30 банковских дней с момента заключения сделки.

Контактный телефон: 8 (0162) 95-02-06.

УНП 200295903

Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 1»

05 августа 2013 г. в 14.30 в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О начислении и выплате дивидендов за первое полугодие 2013 года.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, — 29 июля 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочее время в рабочие дни с 29 июля по 02 августа 2013 г. по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Платонова, 15 либо в день проведения собрания — по месту его проведения.

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.30. Для регистрации иметь: акционеру Общества — паспорт; представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет

УНП 100288960

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0448011 **считать недействительным.**

УНП 101883943

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)

извещает о проведении 22 июля 2013 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец – Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государств	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Однокомнатная квартира инв. № 350/D-44912, площадью 20,1 кв.м	г. Гомель, пр. Космонавтов, д. 96, кв. 136	при администрации Железнодорожного района г. Гомеля.	142 975 000	14 000 000

Шаг аукциона – 5%. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 19 июля 2013 г.**

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет Р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204, ОАО «Гомельоблреклама».

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.04.2013г.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: **www.gomeloblreklama.by** Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: **8 (0232) 74 59 73, 74 17 34.**